# СВЯТА КНІГІ, СВЯТА ЧЫТАЧОЎ

На былым пустыры па завулку Крыленкі веліч-на ўстаў манументальны трохпавярховы будынак — новая Магілёўская абласная бібліятэка імя Ул. І. Леніна. Нядаўна яна гасцінна расчыніла дзверы перад шматлікімі чытачамі. Падзея гэтая стала сапраўдным святам кнігі, святам чытачоў.

Я быў на адкрыцці новага будынку магілёўскай «ленінкі». Дырэктар Ніна Міхайлаўна Саўчанка коратка расказала гісторыю стварэння бібліятэкі, гісторыю яе адраджэння пасля вайны. З цёплай прамовай выступіла госця — намеснік дырэктара Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Ул. І. Леніна І. Санкова. Ірына Аляксандраўна сардэчна павіншавала магілёўчан з цудоўным падарункам, перадала нашай бібліятэцы дзве рэдкія кнігі — «Справаздача Урада Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі VII Усебеларускаму з'езду Саветаў», выдадзеную ў 1925 годзе, і «Першы ўсеагульны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі 1897 года. Магілёўская губерня».

Харошыя падарункі бібліятэцы і чытачам перадалі пісьменнікі-землякі А. Русецкі, М. Аўрамчык, Р. Бярозкін, П. Кавалёў, А. Зарыцкі, К. Губарэвіч, К. Кірэенка — свае кнігі з цёплымі аўтографамі.

З добрымі пажаданнямі супрацоўнікам бібліятэкі і чытачам выступілі загадчык аддзела прапаганды абкома партыі І. Сцепанцоў і старшыня выканкома гарсавета Г. Мануйла. Начальнік абласнога ўпраўлення культуры П. Давыдаў уручыў Ганаровыя граматы вялікай групе будаўнікоў новай бібліятэкі і энтузіястам бібліятэчнай справы.

Назаўтра я прыйшоў сюды на агледзіны. Вось першы паверх. Тут — абанемент, аддзелы мастацтва і перыядычных выданняў. На другім паверсе — агульная зала і даведачна - бібліяграфічны аддзел. А на самай вышыні — выставачная зала, зала навуковых работнікаў, аддзелы беларускай літаратуры і краязнаўства, замежнай літаратуры.

Перш за ўсё, вядома, наведаў я аддзел беларускай літаратуры, якім загадвае бібліёграф Валянціна Сямёнаўна Багачова. Прасторная зала. На стэлажах — любоўна расстаўленыя кнігі і часопісы. На самым відным месцы радкі з верша паэта-земляка:

Дняпроўскі край, зямля
легенд і казак,
Зямля, дзе ў дружбе
хочаш жыць,
Зямля, з якой ад
нараджэння звязан,
Зямля, якою трэба
даражыць.

Добра аформлена выстаўка «Творы магілёўскіх пісьменнікаў».

У час адкрыцця нехта жартам сказаў бібліятэкарам: «Вы нічога не забыліся ў старым памяшканні? Перанеслі адтуль сваю чуласць і клопаты аб чытачу?»

Не, відаць, не забыліся. Работнікі бібліятэкі ветлівыя, тактоўныя. Па дваццаць гадоў працуюць тут Паліна Усцінаўна Ісаенка, Агаф'я Іванаўна Цыброва, Ганна Піліпаўна Прыходзька, Валянціна Дзмітраўна Іванова. Цяпер у іх з'явіліся добрыя памочнікі — выпускнікі Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума.

Добры падарунак атрымалі магілёўскія кнігалюбы!

А. ПЫСІН.